**А.Я.Камінскі,** *ст.выкладчык*

# РОЛЯ ГРАМАДСКІХ СТУДЭНЦКІХ АБ'ЯДНАННЯЎ У ІДЭАЛАГІЧНА-ВЫХАВАЎЧАЙ РАБОЦЕ З МОЛАДДЗЮ

Адной з важных і абавязковых умоў удасканалення выхаваўчай работы ў ВНУ з'яўляецца развіццё сістэмы студэнцкага самакіравання. Гэта сістэма павінна адпавядаць дэмакратычным традыцыям кожнай ВНУ і распаўсюджвацца на ўсе віды студэнцкага жыцця – ад інтэлектуальнага і творчага да бытавога.

Студэнцкае самакіраванне ў ВНУ – гэта асобая форма самастойнай грамадскай дзейнасці студэнтаў і аспірантаў па рэалізацыі функцый кіравання жыццядзейнасцю студэнцкага калектыву ў адпаведнасці з мэтамі і задачамі, якія паўстаюць перад імі. Вядома, што самакіраванне з'яўляецца элементам агульнай сістэмы кіравання выхаваўчым працэсам у ВНУ, максімальна ўлічвае праблемы і запатрабаванні студэнцкага сацыяльнага асяроддзя.

Аналіз дзейнасці грамадскіх аб'яднанняў БДУ культуры і мастацтваў і іншых ВНУ Беларусі, абагульненне матэрыялаў дазволілі сфармуляваць наступныя задачы грамадскіх студэнцкіх арганізацый:

– фарміраванне ў студэнтаў адказных і творчых адносін да навучальнага працэсу, грамадскай і вытворчай дзейнасці;

– дапамога студэнтам па авалоданні навыкамі самастойнай работы і ўсебаковым развіцці асобы метадам актыўнага ўключэння студэнта ў розныя віды дзейнасці;

– забеспячэнне прынцыповасці, аб'ектыўнасці і кампетэнтнасці пры рэалізацыі праў студэнтаў;

– фарміраванне ў членаў калектыву на аснове самастойнасці ў вырашэнні праблем і пытанняў студэнцкага жыцця

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

актыўнай жыццёвай пазіцыі, навыкаў кіравання дзяржаўнымі і грамадскімі справамі;

– выхаванне пачуццяў гаспадара сваёй ВНУ, павагі да правіл пражывання і паводзін у інтэрнаце;

– аказанне дапамогі адміністрацыі, прафесарска-выкладчыцкаму складу ў арганізацыі і ўдасканаленні вучэбна-выхаваўчага працэсу, якая можа праяўляцца ў арганізацыі сістэмы кантролю за вучэбнай і працоўнай дысцыплінай студэнтаў;

– пошук і арганізацыя эфектыўных формаў самастойнай работы студэнтаў;

– арганізацыя вольнага часу студэнтаў;

– арганізацыя сістэмы вывучэння і ўліку грамадскай думкі студэнтаў па важнейшых пытаннях жыццядзейнасці ВНУ і стварэнне ўмоў, якія забяспечваюць удзел кожнага зацікаўленага студэнта ў абмеркаванні тых ці іншых праблем, прыняцці і выкананні пастаноў;

– падтрымка кантактаў з маладзёжнымі аб'яднаннямі іншых ВНУ краіны.

У мэтах паспяховага выканання вышэйпералічаных задач органы студэнцкага самакіравання і грамадскія арганізацыі універсітэта павінны:

– заслухоўваць і абмяркоўваць (з запрашэннем прадстаўнікоў адміністрацыі універсітэта) пытанні арганізацыі, планавання і стымулявання навучальнага працэсу і іншыя пытанні, звязаныя з асноўнымі мэтамі калектыву, уносіць па выніках абмеркавання адпаведныя прапановы і заўвагі;

– рэкамендаваць сваіх прадстаўнікоў у вучоны савет ВНУ, а таксама ў склад іншых органаў, дзейнасць якіх непасрэдна звязана з выкананнем студэнцкімі калектывамі сваіх задач;

– хадайнічаць перад рэктаратам універсітэта аб зніжэнні аплаты за навучанне, пераводзе таленавітых студэнтаў на дзяржаўны кошт навучання;

– прымаць рашэнні, абавязковыя для ўсіх членаў студэнцкага калектыву.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Праца структурных падраздзяленняў па выхаваўчай рабоце садзейнічае сацыяльнай і культурнай кампетэнтнасці, фарміраванню ў студэнтаў навыкаў дзейнасці кіраўнікоў, арганічнага існавання ў камандзе, дапамагае ім засвоіць сацыякультурны вопыт.

Актыўнымі суб'ектамі студэнцкага самакіравання і грамадскай работы ў БДУ культуры і мастацтваў з'яўляюцца звыш 10 аб'яднанняў. Студэнцкі савет універсітэта сваімі галоўнымі мэтамі лічыць стварэнне аптымальных умоў для творчага самавыяўлення студэнтаў у галіне навукі, мастацтва і навучальнага працэсу; развіццё навуковых і культурных сувязей з моладдзю і студэнтамі іншых ВНУ РБ, краін замежжа; дапамогу ў сезонным і пастаянным працаўладкаванні студэнтаў.

Прафсаюзная студэнцкая арганізацыя ажыццяўляе абарону правоў і законных інтарэсаў сваіх членаў, сацыяльную абарону студэнцтва, арганізуе аздараўленне і адпачынак студэнтаў, кантралюе бытавыя ўмовы іх пражывання ў інтэрнатах.

Кіраўнікамі такіх арганізацый павінны быць сапраўдныя лідэры. З гэтай мэтай у нас працуе школа "Лідэр".

Шырокі ўдзел студэнтаў у рабоце грамадскіх аб'яднанняў у ВНУ садзейнічае згуртаванасці студэнтаў, выхаванню ў іх адказнасці за прынятае рашэнняў і іх рэалізацыю.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ